# РАЗДЗЕЛ V
# МОВА І СТЫЛЬ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

## КОЛЬКАСНЫ АСПЕКТ У ЛІРЫЦЫ ЯНКІ КУПАЛЫ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ПАЭМ 1906–1939 ГАДОЎ)

**К. В. Бабровіч**

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, вул. Сурганава, 1, корп. 2, 220072, г. Мінск, Беларусь, bobrovichk67@mail.ru*

На аснове аналізу моўных адзінак з колькасным значэннем выяўлена месца розных часцін мовы ў структуры функцыянальна-семантычнага поля колькасці, а таксама некаторыя асаблівасці іх ужывання ў якасці сродкаў выражэння розных тыпаў колькаснага значэння.

***Ключавые словы:*** колькаснае значэнне; квантытавы; функцыянальна-семантычнае поле колькасці; беларуская мова; Янка Купала.

Колькаснае значэнне можна аднесці да ўніверсальных катэгорый мовы. Для яго даследавання мэтазгодна выкарыстоўваць полевы падыход, які з’явіўся ў другой палове XX ст. у сувязі са зменай кірунку даследаванняў з лінгвістыкі ўніверсалій да вывучэння мовы як арганізаванай сістэмы. Развіццём полевага падыходу займаліся Ё. Трыр, Л. Вайсгербер, Г. Іпсен, О. Духачык, Р. Мэер, Г. Шпербер, М. М. Пакроўскі, В. У. Вінаградаў, А. А. Уфімцава, А. І. Кузняцова, Л. М. Васільеў, А. У. Бандарка, У. Р. Адмоні і інш. Поле ўяўляецца як сукупнасць моўных адзінак, якія аб’яднаны агульнасцю зместу і адлюстроўваюць паняційнае, прадметнае або функцыянальнае падабенства абазначаных з’яў [1–5].

Далейшыя даследаванні прывялі да з’яўлення функцыянальна-семантычных палёў – гэта сукупнасць сродкаў пэўнай семантычнай катэгорыі розных узроўняў мовы, а таксама камбінаваных моўных сродкаў, якія ўзаемадзейнічаюць на базе агульнасці іх семантычных функцый. Кожнае поле ўключае сістэму тыпаў, разнавіднасцей і варыянтаў пэўнай семантычнай катэгорыі, якая суадносіцца з разнастайнымі фармальнымі сродкамі іх перадачы.

У рамках дадзенага даследавання для вызначэння межаў функцыянальна-семантычнага поля колькасці ў якасці моўнага матэрыялу для аналізу былі абраны наступныя паэмы Янкі Купалы: «Нікому» (1906), «Зімою» (1906), «Адплата кахання» (1908), «Сват» (1908), «За чужую елку» (1909),

«Адвечная песня» (1910), «Сон на кургане» (1910), «За чаркай» (1911), «У Купальскую ноч» (1911), «На куццю» (1911), «Аб мужыцкай долі» (1907–1912), «Курган» (1912), «Бандароўна» (1913), «Магіла льва» (1913), «Яна і я» (1913), «На папасе» (1913), «Безназоўнае» (1924), «З угодкавых настрояў» (1927), «Над ракой Арэсай» (1933), «Барысаў» (1934), «Тарасова доля» (1939).

Моўны матэрыял для аналізу атрыманы метадам суцэльнай выбаркі з вышэйпералічаных паэм Янкі Купалы. Усяго ў выбарку ўвайшло 809 моўных адзінак у 672 адзінках кантэксту.

Варта адзначыць, што ў многіх паэмах аўтар не дае імёны сваім героям: яны ўяўляюць сабой абагульнены, тыпізаваны вобраз. Персанажы абязлічаныя і безыменныя, пісьменнік быццам пакідае чытачам магчымасць падставіць імя свайго знаёмага з такім самым лёсам, як у персанажа. У сувязі з гэтым аўтар выкарыстоўвае шмат парадкавых лічэбнікаў для адрознення такіх герояў: ёсць *1-я*, *2-я* і *3-я русалкі*, *відмы* ад *1-га* до *7-га*, іх *таварышы* і шмат іншых. Гэтыя парадкавыя лічэбнікі не ўключаны ў выбарку, паколькі іх колькаснае значэнне становіцца другарадным і не падлягае аналізу.

У абраных творах колькаснае значэнне перадаецца з дапамогай розных лексіка-граматычных разрадаў лічэбнікаў (пэўна-колькасныя, няпэўна-колькасныя, парадкавыя і зборныя), назоўнікаў, прыслоўяў, прыметнікаў, дзеясловаў, а таксама сінтаксічных канструкцый. Дробавыя лічэбнікі адсутнічаюць. Таксама трэба заўважыць, што ў розных паэмах могуць адсутнічаць словы той ці іншай часціны мовы.

Да пэўна-колькасных лічэбнікаў адносяцца 185 моўных адзінак. З іх 153 моўныя адзінкі адлюстроўваюць дакладнае колькаснае значэнне, 32 – прыблізнае. У дадзены лексіка-граматычны разрад уваходзяць наступныя словаформы: *адзін*, *два*, *дзве-тры*, *тры*, *тры-чатыры*, *чатыры*, *пяць*, *шэсць*, *сем*, *восем*, *дзесяць*, *сямнаццаць*, *сорак*, *сорак пяць*, *паўсотні*, *семдзесят пяць*, *сто*, *сотня*, *пяцьсот*, *сотні*, *трыста*, *тысяча*, *тысяч*, *тысяча трыста*, *сорак тысяч*, *мільён*. У атрыманых кантэкстах пэўна-колькасныя лічэбнікі выкарыстоўваюцца для перадачы колькасці часу (у тым ліку ўзросту персанажаў), прасторы, канкрэтных прадметаў (у тым ліку людзей і жывёл), а таксама тых паняццяў, якія называюцца з дапамогай абстрактных, рэчыўных і зборных назоўнікаў. Акрамя таго, пэўна-колькасныя лічэбнікі могуць уваходзіць у склад фразеалагізмаў і ўстойлівых выразаў, напрыклад: *гнуць у тры пагібелі*, *адным словам*.

На долю няпэўна-колькасных лічэбнікаў прыходзіцца 116 моўных адзінак. Дадзены лексіка-граматычны разрад лічэбнікаў прадстаўлены словаформамі *больш*, *замала*, *замнога*, *колькі*, *крыху*, *мала*, *мала-нямала*, *многа*, *найбольш*, *найболей*, *некалькі*, *не мала*, *нямала*, *сколькі*, *столькі*,

*трохі*, *шмат*. З дапамогай гэтых словаформ вядзецца падлік колькасці часу, прасторы, канкрэтных прадметаў (у тым ліку людзей, грошай і багацця), а таксама тых паняццяў, якія апісваюць абстрактныя, рэчыўныя і зборныя назоўнікі. Няпэўна-колькасныя лічэбнікі часцей за ўсё выкарыстоўваюцца для адлюстравання празмернасці – такое значэнне маюць 63 моўныя адзінкі. Значэннем недахопу валодаюць 17 моўных адзінак. Словаформы *многа* і *шмат* ужываюцца паралельна, але цікава адзначыць, што аўтар аддае перавагу словаформе *шмат*: сустракаюцца 33 моўныя адзінкі, у той час як словаформа *многа* прадстаўлена 13 моўнымі адзінкамі.

Парадкавыя лічэбнікі налічваюць 59 моўных адзінак. Сюды адносяцца словаформы *першы*, *другі*, *трэці*, *чацвёрты*, *пяты*, *шосты*, *сёмы*, *восьмы*, *дзясятыя*, *сямнаццаты*, *дваццаць першы*, *сотнія*, *дзевяцьсот трыццаты*. З дапамогай пералічаных словаформ перадаецца колькасць часу (у тым ліку даты і ўзрост персанажаў), прасторы, канкрэтных прадметаў (у тым ліку і людзей).

Зборныя лічэбнікі складаюць 25 моўных адзінак выбаркі. Сюды ўваходзяць словаформы *двое*, *абое*, *траіх*, *чацвёра*, *пяцярых*, *сямёра*. Паказальнае выкарыстанне зборнага лічэбніка *сямёра* ў кантэксце са значэннем прыблізнай колькасці: «Меў ён жонку Міхалінку, // Меў дзяцей **з сямёра**…» [6]. Зборныя лічэбнікі ўжываюцца выключна ў тых кантэкстах, у якіх апісваецца колькасць людзей.

Колькаснае значэнне маюць 102 моўныя адзінкі назоўнікаў. Спіс словаформ багаты і разнастайны. З іх дапамогай можна перадаць колькасць:

- рэчыва: *без меры*, *бочка*, *булка*, *жменя*, *кварта*, *коўш*, *лужа*, *мора*, *напал*, *паўкварты*, *сноп*, *фунт*;
- часу: *век*, *год*, *з паўгадзіны*, *за тыдзень*, *месяц*, *міг*, *мінута*, *паўгода*, *хвіліна*, *час*, *часіну*;
- людзей: *груды*, *гурма*, *куча*, *пара*, *пяцёрка*, *рад*, *хмара*;
- грошай: *грош* (у тым ліку выраз *ні за грош*), *мядзяк*;
- прасторы: *асьміна*, *гектар*, *кіламетр*, *сажань*;
- у спалучэнні са зборнымі назоўнікамі: *воз*, *копка*, *пуд*;
- меры і ступені: *да дна*, *да дня*, *да зары*, *да канца*, *да палавіны*, *да поту*, *да смерці*, *да сягоння*, *да часу*, *па пахі*;
- назоўнік *раз* вызначае колькасць дзеянняў.

У некаторых выпадках колькаснае значэнне ўласціва слову не само па сабе, а з'яўляецца ў кантэксце, напрыклад, у складзе наступнага параўнальнага звароту: «Лажыцеся ў раллю, зярняткі, спаткі, // Накрыйцеся пасцілкай-скібкай, // Пасля збудзіцесь, выгляньце з краваткі, // **Як воўна** – густа, **як дзень** – шыбка!» [6].

Прыслоўі з колькасным значэннем складаюць 156 моўных адзінак. З іх дапамогай можна перадаць колькасць:

- часу: *вечна*, *дасюль*, *даўно*, *доўга*, *здаўна*, *навек*, *навекі*, *назаўсёды*, *наўсяды*, *павек*, *перш*, *спрадвеку*, *штодзень*;
- людзей: *поўна*, *удваём*, *удваіх*, *удваёчку*, *утрох*;
- меры і ступені: *болей*, *болей-меней*, *больш*, *бясконца*, *вельмі*, *годзе*, *гусценька*, *добра*, *досць*, *загуста*, *замала*, *здорава*, *зусім*, *крыху*, *ладна*, *лепей*, *мала*, *менш*, *надта*, *найболей*, *найбольш*, *нямала*, *поўна*, *рэдка*, *саўсім*, *слаба*, *трохі*, *удвое*, *удвойчы*, *часта*, *чуць*, *чуць-чуць*, *шмат*;
- грошай: *незвычайна*.

У рэдкіх выпадках валодаюць колькасным значэннем і прыметнікі. У нашу выбарку трапіла 27 такіх моўных адзінак. Дадзеная часціна мовы прадстаўлена наступнымі словаформамі: *апаследні*, *апошні*, *астатні*, *лішні*, *кожны*, *сталетні*, *цэлы*. Словаформа *лішні* выяўляе колькасны збытак: «Бацькоў гэтым грэхам сваім не пацешыла – // Ужо з дзіцем ты **лішняя** ў хаце» [6]. Словаформы *апаследні*, *апошні*, *астатні* па сваім значэнні набліжаюцца да парадкавых лічэбнікаў для перадачы парадку няпэўнага ліку: «**Апаследні** мяшок // К Калядам я змалоў…» [6]; «Падходзь, чужы і хатні, // Заглянуць раз **астатні** // Вось на таго, што дзетак // Без часу кінуў гэтак» [6]. Прыметнік *сталетні* азначае колькасць пражытых гадоў. Прыметнік *цэлы* ўказвае на агульнасць, непадзельнасць колькасці: «…Але не скрыці ад нікога // Нам крыўды **цэлай** грамады!» [6]. Яны перадаюць колькасць часу (у тым ліку ўзрост персанажаў), канкрэтных прадметаў (у тым ліку і людзей).

У дзеясловаў нізкі патэнцыял для адлюстравання колькаснага значэння, аднак у рэдкіх выпадках можна сустрэць падобныя кантэксты. У паэме «За чужую елку» змяшчаецца адна такая моўная адзінка – *ня ўбывае*: «Як на чорнай на зямельцы // Грэху **ня ўбывае**...» [6].

Самым арыгінальным спосабам перадаць колькаснае значэнне можна лічыць ужыванне сінтаксічных канструкцый. Выдзяленне дадзенай групы звязана з тым, што колькаснае значэнне нясе ў сабе не асобнае слова, а словазлучэнне ці сінтаксічная канструкцыя цалкам, нягледзячы на тое, што фармальна можна вызначыць галоўнае слова. Гэта група складаецца з дзвюх супрацьлегласцей: устойлівых выразаў тыпу *адзін аднаго* і ўнікальных аўтарскіх разгорнутых апісанняў колькасці. У выбарку ўвайшло 138 такіх моўных адзінак. Яны выкарыстоўваюцца для адлюстравання значэння:

- прамежку часу: *ад вясны да восені*; *ад нядзелі да нядзелі*; *ад рана да рана*; *ад рання і да ночы*; *ад расы і да расы*; *вялікі час*; *год дваццаць бязмала*; *год, не болей*; *дзень у дзень*; *днём і ночай*; *з вечара да рання*; *з году ў год*; *з дня ў дзень, з года ў год*; *з зары да зары*; *з лета ў лета*; *за годам год*; *за час кароткі*; *змалку да скanання*; *крыху часіны*; *леты і зімы*; *на час нязбыты*; *тры дні і тры ночы*; *увесь век*; *цэлы век*; *час нейкі*;

- меры і ступені: *жменяй поўнай*; *жудчэй яшчэ*; *колькі хваце*; *пудзік, другі*; *хоць трошкі*; *шмат дужэйшы*; *штораз больш*; *штораз менш*; *яшчэ сумней*;
- платы: *вяліку дань*; *марныя злоты*; *поўны гуслі*;
- прасторы: *ветрам хоць развей*; *на цэлы бел-свет*; *не змерыць і вокам*; *свет цэлы*; *як можа змерыць вока*.

У азначаную групу ўвайшлі і ўзмацняльныя паўторы: «Трэба **многа, яшчэ многа тысяч** // Рук завабіць…» [6].

Такім чынам, даныя аналізу пацвярджаюць, што лічэбнікі складаюць ядро функцыянальна-семантычнага поля колькасці (385 моўных адзінак, 47,6 % ад агульнай колькасці). За выключэннем дробавых лічэбнікаў, у аналізуемых паэмах можна знайсці прыклады выкарыстання ўсіх лексіка-граматычных разрадаў гэтай часціны мовы: пэўна-колькасныя (22,9 %), няпэўна-колькасныя (14,3 %), парадкавыя (7,3 %) і зборныя (3,1 %). Блізка ад ядра знаходзяцца прыслоўі (19,3 %), сінтаксічныя канструкцыі (17,0 %) і назоўнікі (12,6 %). Да перыферыі поля можна аднесці прыметнікі (3,3 %) і дзеясловы (0,2 %), што сведчыць аб нізкім патэнцыяле гэтых часцін мовы ў якасці сродку для перадачы колькаснага значэння.

Таксама неабходна ўлічваць тыя тыпы колькаснага значэння, якія характэрныя для словаформ пералічаных часцін мовы. Так, чым больш спецыфічнае значэнне мае падгрупа, тым менш сродкаў для выражэння колькаснага значэння можа спалучацца з такімі словаформамі. Напрыклад, колькаснае значэнне часу можа адлюстроўвацца з дапамогай амаль усіх сродкаў (няма прыкладаў выкарыстання зборных лічэбнікаў і дзеясловаў), тады як для перадачы ўзросту персанажаў выкарыстоўваюцца толькі пэўна-колькасныя і парадкавыя лічэбнікі, а таксама прыметнікі. Для абазначэння даты ўжываюцца толькі парадкавыя лічэбнікі.

Колькасць прасторы можа апісвацца з дапамогай пэўна-колькасных, няпэўна-колькасных і парадкавых лічэбнікаў, назоўнікаў і сінтаксічных канструкцый.

Колькасць канкрэтных прадметаў можна паказаць з дапамогай пэўна-колькасных, няпэўна-колькасных і парадкавых лічэбнікаў, прыслоўяў, назоўнікаў і сінтаксічных канструкцый. Тыя ж сродкі выкарыстоўваюцца для падліку колькасці грошай. Для перадачы колькасці людзей магчыма ўжыванне зборных лічэбнікаў і прыметнікаў.

Колькаснае вымярэнне абстрактных паняццяў ажыццяўляецца з дапамогай пэўна-колькасных, няпэўна-колькасных і парадкавых лічэбнікаў, назоўнікаў, дзеясловаў і сінтаксічных канструкцый.

Для акрэслення колькасці рэчыва выкарыстоўваюцца пэўна-колькасныя і няпэўна-колькасныя лічэбнікі, прыслоўі і назоўнікі.

Паняцці, якія перадаюцца зборнымі назоўнікамі, могуць мець колькаснае значэнне ў спалучэнні з назоўнікамі, пэўна-колькаснымі і няпэўна-колькаснымі лічэбнікамі.

Традыцыйна значэнне меры і ступені суадносіцца з адпаведным лексіка-граматычным разрадам прыслоўяў. Аднак падобным значэннем могуць валодаць пэўна-колькасныя лічэбнікі і сінтаксічныя канструкцыі.

Адсутнічаюць прыклады ўжывання парадкавых лічэбнікаў і сінтаксічных канструкцый са значэннем колькасці рэчыва і зборных прадметаў. Звяртаюць на сябе ўвагу прыметнікі і дзеясловы, якія рэдка выкарыстоўваюцца для перадачы колькаснага значэння: першыя ўказваюць на колькасць часу і канкрэтных прадметаў, другія апісваюць колькаснае значэнне абстрактных паняццяў.

Выкарыстанне моўных адзінак з колькасным значэннем розных часцін мовы абмяжоўваецца магчымасцямі лексічнай і сінтаксічнай спалучальнасці.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Бондарко А. В.* Грамматическая категория и контекст. Л. : Наука, 1971.
2. *Бондарко А. В.* Функциональная грамматика. Л. : Наука, 1984.
3. Проблемы функциональной грамматики. Полевые структуры / под ред. А. В. Бондарко. СПб. : Наука, 2005.
4. Теория функциональной грамматики: Введение. Аспектуальность. Временная локализованность. Таксис / под ред. А. В. Бондарко. Л. : Наука, 1987.
5. Теория функциональной грамматики: Качественность. Количественность / под ред. А. В. Бондарко. СПб. : Наука, 1996.
6. *Купала Я.* Вершы. Паэмы. П’есы. Мінск : Харвест, 2012.